# *СЕКЦИЯ 6*
# *ИННОВАЦИОННЫЕ ТЕХНОЛОГИИ ПОДГОТОВКИ СПЕЦИАЛИСТОВ АПК*

**УДК 947.6:378.01**

## КІРУЕМАЯ САМАСТОЙНАЯ РАБОТА СТУДЭНТАЎ ЯК СРОДАК ДАДАТКОВАЙ МАТЫВАЦЫІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ГІСТАРЫЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН)

**Мяньчэня С.В., выкладчык**
*УА "Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт",*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Репозиторий БГАТУ

### Уводзіны

Сучасная сістэма вышэйшай адукацыі прадугледжвае фарміраванне кампетентнаснай асобы, якая валодае высокімі прафесійнымі навыкамі і накіравана на свядомае павышэнне кваліфікацыі, самаадукацыю і самаразвіццё [3, с.77]. Значная ўвага ў гэтым накірунку надаецца арганізацыі кіруемай самастойнай работы студэнтаў. Кіруемая самастойная работа ў шырокім сэнсе разумеецца як сродак уцягвання студэнтаў у самостойную пазнавальную і практычную дзейнасць. Яна павінна забяспечыць пераход з прынцыпаў абучэння да самаадукацыі студэнтаў, знізіць аўдыторную нагрузку і змяніць ролю выкладчыка з "рэтранслятара ведаў" на арганізатара вучэбнай і даследчай дзейнасці.

Увядзенне новых прынцыпаў і рэфармаванне сістэмы вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь закранула скарачэнне як агульнай колькасці гадзін, якія адводзяцца на вывучэнне дысцыплін соцыё-гуманітарнага блоку, так і аўдыторную нагрузку. Так, напрыклад, калі ў 2011/2012 навучальным годзе ў Беларускім дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэце на вывучэнне курса "Гісторыя Беларусі" адводзілася 138 гадзін (у тым ліку 66 аўдыторных, форма кантролю – экзамен), то ў 2012/2013 –72 гадзіны (у тым ліку 34 аўдыторных, форма кантролю – дыферэнцаваны залік). Такія змены аказваюць уплыў на матывацыю студэнта. Традыцыйна большая ўвага надаецца тым прадметам, па якіх трэба здаваць экзамен. Астатнія адыходзяць на другасны план, і адпаведна змяншаецца час на падрыхтоўку да гэтых заняткаў.

Ва умовах скарачэння колькасці аўдыторных гадзін, значна ўзрастае роля самастойнай працы студэнтаў. Некаторыя тэмы патрабуецца выкладаць сцісла, што дазваляе захаваць інфарматыўнасць, аднак перанасычвае студэнтаў сухімі фактамі. Значны аб'ём інфармацыі

студэнтам трэба засвоіць самастойна, і таму задача выкладчыка не толькі кантраляваць гэты працэс, але і заахвоціць студэнта да вывучэння свайго прадмета. Без дадатковай матывацыі дасягненне высокіх вынікаў немагчыма.

## Асноўная частка

Традыцыйнымі формы кіруемай самастойнай работы студэнтаў застаюцца напісанне рэфератаў, дакладаў, падрыхтоўка тэарэтычных паведамленняў, водгукаў, эсе і т.д. Звернемся да навуковай трактоўкі некаторых з іх.

Рэферат – гэта творчая работа з элементамі даследвання, заснаваная на вывучэнні значнай колькасці навуковай літаратуры па выбранай тэматыцы. Даклад – вынік самастойнай творчай работы студэнтаў, пры выкананні якой, студэнты прапаноўваюць і абгрунтоўваюць навуковую тэорыю. Тэарэтычнае паведамленне – невялікая работа на аснове 1 -2 навуковых крыніц [4, с.43].

Такім чынам, дадзеныя віды работы заснаваны на творчай даследчай дзейнасці студэнта. Аднак пры нізкай зацікаўленасці – гістарычныя дысцыпліны не з’яўляюцца профільнымі; наяўнасці выхада ў Internet і магчымасці знайсці там гатовы прадукт, студэнты не будуць самастойна працаваць з літаратурай. У гэтым выпадку самастойная праца студэнта зводзіцца ў лепшым выпадку да кампіляцыі некалькіх крыніц і афармлення структуры работы. Якасць такіх работ даволі часта невысокая, а студэнты не арыентуюцца ў тэксце.

Вырашанне дадзенай праблемы пры вывучэнні гістарычных дысцыплін знаходзіцца не ў забароне электронных рэсурсаў, што немэтазгодна, улічваючы іх інфармацыйныя магчымасці, а пабудове самастойнай работы на новых прынцыпах, якія прадугледжваюць творчы характар, накіраваны на індывідуальнае вырашэнне нетрадыцыйных задач [4, с. 44].

Эфектыўная самастойная работа заснавана на ўзаемадзеянні выкладчыка і студэнтаў. Арганізацыя кіруемай самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае актыўную работу выкладчыка па забяспячэнню станоўчай матывацыі індывідуальнай і групавой дзейнасці студэнтаў, праверцы прамежкавых вынікаў і арганізацыі самакантроля і самакарэкцыі ведаў [1, с. 10]. Прывядзем прыклады некаторых відаў кіруемай самастойнай работы студэнтаў, якія актыўна выкарыстоўваюцца выкладчыкамі кафедры філасофіі і гісторыіі БДАТУ пры арганізацыі навучальнага працэса па курсах “Гісторыя Беларусі” і “Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)”.

1. Творчыя заданні гульнёвай формы, адказ на якія патрабуе інфармацыі выходзячай за рамкі курса.

Рэпазiторый БГАТУ

Так, напрыклад, простае пытанне “Чаму Баба-Яга лятае ў ступе?” на першы погляд ніякім чынам не звязана з гісторыяй. Аднак адказ на яго мы знаходзім у міфалогіі і этнаграфіі. Баба-Яга – гэта адна з багіняй смерці ў славян. Сустрэча з ёй гэта сур’ёзнае выпрабаванне, пасля праходжання якога, герой набывае цудоўныя звышздольнасці, ці артэфакты неабходныя для барацьбы са злой сілай. Ступа ў славянскай міфалогіі таксама звязана з культам смерці. У дахрысціянскі час рэшткі нябожшчыка пасля спалення таўклі ў асобых ступах і ўжо пасля змяшчалі ў пахавальны гаршок. Такім чынам, у міфалогіі Баба-Яга і ступа звязаны культам смерці, і гэтая сувязь знайшла адлюстраванне ў казках і паданнях [2, с. 172]. Заданні падобнага тыпу дазваляюць студэнту знайсці сувязь паміж мінулым і сучаснасцю, актывізуюць даследчую дзейнасць.

2. Заданні звязаныя з гісторыка-культурнай спадчынай Беларусі.

Студэнтам прапаноўваецца лакалізаваць месцазнаходжанне мінскага гета і падрыхтаваць вітуальную экскурсію па ім, альбо знайсці вуліцы горада, названыя ў гонар герояў падполля. Заданні падобнага тыпу дазваляюць візуалізаваць навучальны працэс, выкарыстоўваць тэхнічныя сродкі навучання, навыкі работы ў группе. Студэнтам жа даецца магчымасць “дакрануцца” да гісторыі і зразумець, што падзеі мінулага адлюстраваны не толькі на старонках падручнікаў. Работа з гісторыка-культурнай спадчынай station ўплывае на развіццё пачуцця патрыятызму і павагі да мінулага, матывіруе студэнта на наведвання гістарычных мясцін.

3. Даследванні на тэму “Гісторыя маёй малой Радзімы” ці “Падзеі Вялікай Айчыннай вайны ў маім родным краі”. Выкладчыкі накіроўваюць студэнта на пошук аб гісторыі і падзеях звязаных з іх роднымі мясцінамі – гарадамі, раёнамі, вёскамі.

Як паказвае практыка, студэнты з ахвотай выконваюць дадзеную работу, звяртаюцца да школьных музеяў, рыхтуюць прэзентацыі, выкарыстоўваюць інфармацыю і фотаздымкі з сямейных архіваў. Асобная частка такіх даследванняў прысвечана сямейнай гісторыі – складанне радавода, ці генеалагічнага дрэва, ўспаміны сваякоў аб падзеях вайны, што з’яўляецца каштоўнай інфармацыяй па паўсядзённай гісторыі і дазваляе студэнту суаднесці гісторыю народа з гісторыяй адной сям’і і гісторыю краіны з гісторыяй аднаго населенага пункта.

4. Стымуляванне даследчай дзейнасці студэнтаў шляхам перыядычнага правядзення студэнцкіх навуковых канферэнцый. Канферэнцыі праводзяцца штогадова на базе кафедры філасофіі і гісторыіі па дысцыплінах, якія выкладаюцца на кафедры. У 2012 годзе гістарычныя дысцыпліны выдзелены ў асобную падсекцыю.

У спалучэнні гэтыя віды самастойнай работы дазваляюць матывіраваць студэнтаў да вывучэння гісторыі і развіваць іх даследчыя і пазнавальныя навыкі, але толькі пры ўмове, што студэнты маюць матывацыю да ўспрымання ведаў гістарычнай навукі як дысцыпліны і любых ведаў увогуле і разглядаюць сам працэс навучання як сродак самаразвіцця.

**Заключэнне**

Такім чынам, апошнія тэндэнцыі ў вышэйшай адукацыі ставяць перад выкладчыкамі задачу фарміравання кампетентнаснай асобы, якая дасягаецца за кошт эфектыўнай і творчай самастойнай работы студэнта.

Прыпцыпы арганізацыі кіруемай самастойнай работы студэнтаў прадугледжваюць яе творчы характар, шматварыятыўнасць выканання і індывідуальны падыход.

Эфектыўнасць работы залежыць ад працэса ўзаемадзеяння выкладчыка і студэнта. Важная роля адводзіцца прафесійным навыкам выкладчыка, яго арганізатарскім здольнасцям і творчаму мышленню. Аднак без жадання студэнта самаразвівацца дасягнуць поспеху будзе немагчыма.

**Літаратура**

1. Лобанов, А.П. Управляемая самостоятельная работа студентов в контексте инновационных технологий/ А.П. Лобанов, Н.В. Дроздова. – Минск: РИВШ, 2005. – 107 с.

2. Матюшин, Г.Н Историческое краеведение: Учеб. пособие для студентов пед ин-тов по спец. № 2108 «История». – М.: Просвещение, 1987. – 207 с.

3. Научно-методические инновации в высшей школе/ под общ. ред. проф. А.В. Макарова. – Минск: РИВШ, 2008. – 186 с.

4. Сергеенкова, В.В. Управляемая самостоятельная работа студентов. Модульно-рейтинговая и рейтинговая системы / В.В. Сергеенкова – Минск: РИВШ, 2005. – 131 с.

**УДК 378:001.895**

# ОБ ИГРОВЫХ МЕТОДАХ В ПРОЦЕССЕ ПРЕПОДАВАНИЯ ФИЛОСОФИИ СТУДЕНТАМ ИНЖЕНЕРНЫХ СПЕЦИАЛЬНОСТЕЙ

**Ломако Л.В., ст. преподаватель, Чубрик Р.И., ст. преподаватель**
*УО «Белорусский государственный аграрный технический университет», г. Минск, Республика Беларусь*

**Введение**

Актуальность и эффективность применения игровых методов в процессе преподавания философии и других дисциплин обусловлена, прежде



Репозиторий БГАТУ